

РАМОНТ — ВЯЛІКІ І ДРОБНЫ 13

ВАРОТЫ Ў ЗІМУ 16




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

10 ЛІСТАПАДА 2023 г. ПЯТНІЦА № 218 (30098)


КОРАТКА

• **Мінская вобласць пашырыла геаграфію экспарту малочнай прадукцыі да 33 краін.**

• Беларуская пасажырская тэхніка будзе выкарыстоўвацца ў Казані падчас Гульняў і саміту БРІКС.

• **Беларускія прадпрыемствы ўдзельнічаюць у кірмашы ў Гаване.**

• Алею дружбы Манголіі і Беларусі заклалі ў Мінску да 30-годдзя дыпламатычных адносін.

• **Новая водалячэбніца ў Браслаўскай ЦРБ пасадзейнічае развіццю аздараўленчага турызму.**



• Слуцкі сыраробны камбінат пачаў рэалізацыю праекта па вытворчасці лактаферыну.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар НАЗАРУК, намеснік міністра замежных спраў:**

*«Калектыўны Захад, які заўсёды выступаў за рынкавыя ўмовы, увёўшы незаконныя з пункту гледжання міжнароднага права санкцыі, па сутнасці абрынуў панянцце рынкавых адносін. Гэтыя пытанні сталі для нас зусім відавочнымі. Беларусь не будзе біцца галавой аб бетонную сцяну, якую ёй узвялі на шляху яе тавараў. Мы знойдзем рынкі збыту ў новых краінах — так званай далёкай дузе. Так, на нейкім этапе будуць дадатковыя выдаткі на транспарт, асваенне рынку, але далей пойдзе нармальная і планамерная работа».*

# Парламенцкія выбары, кадры і Мінск

## Падрабязнасці сустрэчы Прэзідэнта з Наталляй Качанавай

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са Старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай. На парадку дня — пытанні, якія не губляюць сваёй важнасці для грамадства і краіны.**



Першае пытанне, якое акрэсліў кіраўнік дзяржавы, — хуткія парламенцкія выбары. «У вас ёсць цэлы зрэз тых праблем, якія трэба будзе пракантраляваць пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў», — падкрэсліў ён. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што дэталёва гэтыя пытанні будуць абмеркаваны на хуткай нарадзе з прадстаўнікамі палітычных партый, якія прайшлі рэгістрацыю і маюць намер удзельнічаць у парламенцкіх выбарах. Па словах Прэзідэнта, неабходна абмеркаваць сітуацыю на месцах. «Мы сказалі, што будзем усялякі ўдзельнічаць у гэтых выбарах, я маю на ўвазе вертыкаль улады. Гэта вельмі важная кампанія ў Беларусі. Больш важнай палітычнай кампаніі ў наступным годзе няма. І следам жа фарміраванне Усебеларускага народнага сходу, абранне дэлегатаў. Як ідуць справы з вашага пункту гледжання? — пацікавіўся Прэзідэнт. — І я прашу вас і далей не адыходзіць ад гэтай тэмы, наколькі магчыма, наколькі трэба будзе, Цэнтральнай выбарчай камісіі дапамагаць і падтрымліваць іх разам з Адміністрацыяй Прэзідэнта і ніжняй палатай парламента».

Другое пытанне — кадравыя праблемы. «Я хацеў бы, каб Савет Рэспублікі меў канцэнтраваную думку, і хацеў бы ад вас пачуць на дадзены момант, як ідуць справы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Трэцяе пытанне — Мінск, паколькі Наталля Качанава — упаўнаважаны Прэзідэнта па Мінску. «Як ідуць тут справы? Мяне цікавяць пытанні забеспячэння насельніцтва, найперш усім неабходным, прадуктамі харчавання, адзеннем, абуткам, як адчуваюць сябе мінчане ў гэтай сітуацыі?» — пацікавіўся кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў актыўную работу сенатараў у краіне, шматлікія сустрэчы з людзьмі ў розных рэгіёнах. «Вы мне абяцалі, што будзеце канцэнтраваць тое, што адбываецца ў Беларусі, і далажыце пры неабходнасці. Хацеў бы пачуць вашу пазіцыю ў гэтым плане», — сказаў ён.

Наталля Качанава падкрэсліла, што ідзе падрыхтоўка да важнага электаральнага перыяду ў жыцці нашай краіны. «Гэта палітычна важна для нас усіх. І я хацела б сказаць, што мясцовыя органы ўлады, губернатары — усе актыўна ўключыліся ў гэтую работу. Варта адзначыць, што актыўна ўключыліся ў гэту работу і нашы грамадскія арганізацыі, палітычныя партыі. Мы бачым гэтую актыўнасць. Людзі разумеюць, наколькі гэта важна і наколькі важны гэты перыяд у жыцці краіны. Мы адсочваем сітуацыю, якая складваецца на месцах, якія ёсць праблемы, якія ёсць пытанні», — адзначыла яна. Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу, што падчас электаральнай кампаніі кандыдаты ў дэпутаты заўсёды гавораць аб тых пытаннях, у вырашэнні якіх яны будуць аказваць садзейнічанне нашым людзям, выбаршчыкам. «Вядома, мы адсочваем і гэтыя пытанні, наколькі вырашаны тыя праблемы і задачы», — падкрэсліла спікер.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Спецыяльны рэпартаж

# ПА КОЛЕРЫ І ПРЫЗНАЧЭННІ

## сартуюць адходы на новым комплексе пад Оршай

**Выраб шчапы, драбненне буйнапамерных адходаў, кампаставанне арганікі, ачыстка сцёкаў і сартаванне другаснай сыравіны не проста на пластык, шкло і паперу, але па колеравай і мэтавай прыналежнасці (малочныя ПЭТ-бутэлькі, зялёная і карычневая пластыкавая тара, празрыстыя ПЭТ-бутэлькі, упакоўкі з-пад бытавой хіміі, бляшанкі, ёмістасці ад аўтамабільных рэчываў — усё паасобку). Такія задачы выконваюць на новым смеццесартавальным комплексе, што нядаўна запрацаваў на базе палігона цвёрдых камунальных адходаў непадалёк ад Оршы.**

СТАР. 4



Па палічках

# Пенсіянер падатак на адну кватэру не плаціць,

## нават калі ў гэтым жыллі зарэгістраваны іншыя асобы



**Як вядома, штогод да 15 лістапада ўсе ўласнікі павінны выплаціць маёмасныя падаткі. У гэтым годзе нашы грамадзяне даплачваюць падатак на нерухомасць у шматкватэрных дамах і зямельны падатак за 2022 год, паколькі ў мінулым годзе яны ўносілі авансавы плацеж у памеры 50 %. А транспартны падатак выплачваецца цалкам за ўвесь мінулы год. Паведамленні на выплату падаткаў накіраваны па пошце альбо ў асабісты кабінет плацельшчыка на партале падатковых органаў. Падобныя паведамленні жыхары Мінска атрымалі яшчэ летам, тады ж многія і аплацілі ўсё, што належала. Але не ўсе. Нагадваем, яшчэ ёсць час. А сёння на актуальныя пытанні, якія датычацца выплаты маёмасных падаткаў, адказаў на прэс-канферэнцыі ў БелТА начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Андрэй КАВАЛЕЎСКІ.**

СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцовы.




# Пенсіянер падатак на адну кватэру не плаціць...

## Маёмасныя падаткі ўжо выплачаныя на 70 %

Спецыяліст міністэрства адзначыў, што падатковыя органы пастаянна маніторацы пытанне выплаты маёмасных падаткаў. «Па стане на 8 лістапада паступіла больш за 70 % усіх трох відаў маёмасных падаткаў. Найбольшы працэнт паступленняў забяспечаны па зямельным падатку — практычна 90 %. Па падатку на нерухомасць — гэта звыш 80 %. Па транспартным падатку стаўкі крыху вышэйшыя ў параўнанні з падаткам на нерухомасць, таму яго нашы грамадзяне выплачваюць крыху пазней. Штогадовая практыка паказвае, што да 15 лістапада забяспечваецца паступленне больш за 90 % ад дадзеных сум», — патлумачыў ён.

Усяго маёмасныя падаткі павінны заплаціць прыкладна 3,5 мільёна жыхароў нашай краіны.

## Хто гэтыя зборы плаціць не абавязаны

Асноўныя льготы, якія даюцца фізічным асобам па падатку на нерухомасць і зямельным падатку, — вызваленне шматдзетных сем'яў ад аплаты падаткаў на ўсе аб'екты нерухомасці, гэта значыць, кватэры (нават калі ў іх ва ўласнасці іх некалькі), жылыя дамы, гаражы, дачы, садовыя домікі і зямельныя ўчасткі.

А вось ільгота па адной кватэры з 2022 года адменена. З мінулага года ўсе людзі, якія валодаюць нават адной кватэрай, абавязаны аплачваць падатак на нерухомасць. Не плацяць яго толькі людзі, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту (мужчыны — 63 гады, жанчыны — 58 гадоў), альбо інваліды I—II групы. Для такіх асоб прадугледжана вызваленне ад падатку на нерухомасць: адной кватэры, якая належыць ім на праве ўласнасці або атрымана па спадчыне, а таксама аднаго жылога дома.



Пры гэтым ільгота выдзяляецца незалежна ад таго, ці зарэгістраваныя ў гэтых памяшканнях працаздольныя члены сям'і альбо іншыя асобы. «Такім чынам, калі ў пенсіянера ва ўласнасці ёсць адна кватэра і адзін жылы дом, то ён не плаціць падатак на нерухомасць. Падатак неабходна аплачваць толькі ў выпадку, калі ў пенсіянера па ўзросце маецца, да прыкладу, дзве кватэры. У гэтым выпадку адна кватэра льгатуецца, а другая абкладаецца падаткам. Пры гэтым у падатковым заканадаўстве прапісана, што цяпер ад падатку на нерухомасць вызваляецца тая кватэра, кошт якой вышэйшы. Гэта значыць, ад пачатку Падатковы кодэкс дэкларуе, што льгатуецца аб'ект, па якім сума падатку большая», — дадаў Андрэй Кавалеўскі.

Ёсць і нюанс па льгоце на падатак на нерухомасць для шматдзетных. Льгота дзейнічае, пакуль у сям'і ёсць трое дзяцей да 18 гадоў. Пры гэтым, калі дзіця валодае нерухомасцю, то да 18 гадоў яна ў любым выпадку не плаціць падатак. А наогул любыя непаўналетнія не плацяць такі падатак, праўда, часова — пакуль не вырастуць.

Што датычыцца льгот па транспартным падатку, то тут крыху іншы парадак. Стаўка падатку паніжаецца на 50 %, калі транспартны сродак зарэгістраваны ў органах ДАІ на пенсіянера па ўзросце, інваліда I—II групы, аднаго з бацькоў у шматдзетнай сям'і. Але ёсць адна важная ўмова: у такой асобы павінна быць сапраўднае пасведчанне кіроўцы адпаведнай катэгорыі. Для інвалідаў III групы стаўка транспартнага падатку паніжаецца на 25 % пры той жа ўмове. Акрамя таго, ад аплаты транспартнага падатку вызваляюцца электрамабілі, што прыводзяцца ў рух выключна электрычным рухавіком. Таксама ад падатку вызваляюцца транспартныя сродкі, выпушчаныя да 1992 года.

## Якія існуюць стаўкі

У Падатковым кодэксе прадугледжаны парадак вылічэння зямельнага падатку, падатку на нерухомасць і транспартнага падатку. Напрыклад, для падатку на нерухомасць устаноўлена разліковая цана тыпавога аб'екта нерухомасці. Яна дыферэнцыраваная па відах аб'екта і па тэрыторыях, на якіх размешчаны аб'ект. Пасля гэтага плошча памнажаецца на разліковую цану і прымяняецца адпаведная стаўка падатку.

Напрыклад, калі ўзяць двухпакаёвую кватэру плошчай 60 «квадратаў» у Мінску. Сума падатку па ёй складае каля 50 рублёў за год. Улічваючы, што ў мінулым годзе аплачваўся аванс, то падлягае да аплаты парадку 25 рублёў падатку на нерухомасць.

Зямельны падатак лічыцца зыходзячы з кадастравага кошту зямельнага ўчастка і стаўкі падатку.

Па транспартных сродках трохі іншы парадак. У Падатковым кодэксе транспартныя сродкі разведзеныя па катэгорыях: легкавыя, грузавыя, матацыклы і гэтак далей. Стаўкі прымяняюцца ў залежнасці ад дазволенай максімальнай масы такога транспартнага сродку альбо колькасці пасадачных месцаў для аўтобусаў.

«Пры гэтым зямельны падатак, падатак на нерухомасць і транспартны падатак вылічаюцца падатковым органам зыходзячы з часу фактычнага валодання. Калі транспартны сродак знаходзіўся на ўліку ў органах ДАІ тры месяцы, то падатак лічыцца толькі за тры месяцы. Гадавая стаўка размяркоўваецца прапарцыянальна перыяду валодання транспартным сродкам», — расказаў начальнік упраўлення.

## Адна «паперка» пра ўсе падаткі

Заканадаўствам прадугледжана, што падатковыя органы накіроўваюць фізічным асобам паведамленні на аплату маёмасных падаткаў. «З мінулага года ўсе падаткі ўжо звезданыя да адзінага паведамлення. У адным паведамленні сабраны ўсе аб'екты падаткаабкладання па ўсёй краіне, якія належаць канкрэтнай фізічнай асобе. Гэта вельмі зручна, калі чалавек атрымлівае аднаразовае паведамленне, дзе пазначаны ўсе аб'екты і прыведзены разлік падатку. «Можна загадзя спланаваць свае ўласныя сродкі для выплаты падатку», — адзначыў спецыяліст.

Аплаціць падаткі можна датэрмінова або часткамі. Галоўнае, каб уся сума паступіла ў бюджэт не пазней за 15 лістапада. Тым, у каго адкрыты асабісты кабінет на партале падатковых органаў, паведамленні накіроўваюцца туды. Поштай паведамленні атрымліваюць тыя, хто не карыстаецца парталам.

## Як плаціць

Самы асноўны спосаб — з дапамогай адзінай разліковай інфармацыйнай прасторы (АРІП). Скарыстацца ёй можна праз інфакіёскі, мабільныя дадаткі альбо інтэрнэт-версіі банкаўскіх дадаткаў. У меню неабходна выбраць «падаткі», увесці ўліковы нумар плацельшчыка, які змяшчаецца ў паведамленні, і ажыццявіць аплату. Падаткі можна аплаціць таксама ў аддзяленнях банкаў або паштовай сувязі наяўнымі альбо з выкарыстаннем банкаўскіх плацежных картак.

## Уладальнікам спарткараў і машын прэміяльных брэндаў могуць павялічыць падатак

Канчатковага спіса машын з павышаным падаткам пакуль няма, але вядомы брэнды, якія трапяць у пералік з высокай доляй верагоднасці.

Гэта новыя аўтамабілі Ferrari і Maserati, якія, хутчэй за ўсё, абкладуць павышаным падаткам, паведаміў Андрэй Кавалеўскі. Таксама ў спіс, як чакаецца, трапяць машыны Maybach. Магчыма, будуць там і некаторыя мадэлі Mercedes, BMW, Audi.

Калі для асноўнай катэгорыі грамадзян будзе рабіцца звычайная індэксацыя ставак транспартнага падатку (у межах да 10 рублёў), то для пэўнай катэгорыі ўладальнікаў аўто, якія маюць транспартныя сродкі павышанай камфортнасці, машыны прэміум-класа, стаўку падатку прапануецца павялічыць у 10 разоў. Паводле інфармацыі органаў рэгістрацыі, гаворка ідзе пра амаль дзве тысячы машын.

«Важная ўмова, каб з моманту выпуску транспартнага сродку прайшло не больш за тры гады», — падкрэсліў спецыяліст падатковай службы.

Пастанова Саўміна з поўным спісам аўтамабіляў будзе прынятая толькі пасля таго, як запрацуе новая рэдакцыя Падатковага кодэкса. Раней у Палаце прадстаўнікоў заявілі, што ў другім чытанні кодэкс маюць намер прыняць да канца лістапада.

Традыцыйна новыя рэдакцыі галоўнага падатковага дакумента ўступаюць у сілу з 1 студзеня чарговага года. Гэта азначае, што ў студзені ўжо можа быць пастанова па аўтамабілях. Аднак наш эксперт не выключыў, што гэта адбудзецца і вясной.

## Падатак на скутар

Нагадаем, што сёлета транспартны падатак прыйдзецца плаціць уладальнікам такіх машын, як трыцыкл, матакаляска, матаролер, лакамабіль, мапед, скутар і іншыя, хоць у мінулым годзе яны яго не плацілі. Стаўка — 41 рубель. Наогул, аб падатку варта ведаць такую важную рэч: ён плаціцца за ўсе транспартныя сродкі, зарэгістраваныя ў ДАІ МУС.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Дзярждэп ЗША канстатаваў, што Еўропа стала асноўным рынкам збыту амерыканскага ЗПГ на гады наперад



Еўропа ператварылася ў асноўны рынак збыту амерыканскага звадкаванага прыроднага газу на гады наперад. Пра гэта заявіў памочнік дзяржсакратара ЗША па пытаннях энергарэсурсаў Джэфры Паят падчас свайго выступлення ў камітэце па замежных справах Сената Кангрэса ЗША на слуханнях, прысвечаных сітуацыі вакол Украіны, паведаміла ТАСС. Раней генеральны дырэктар па энергетыцы Еўракамісіі Дыцї Юль Ёргенс заяўляла, што залежнасць Еўрасаюза ад экспарту амерыканскага звадкаванага прыроднага газу будзе назірацца на працягу найбліжэйшых дзесяцігоддзяў. У кастрычніку Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін выказаў меркаванне, што еўрапейскія краіны будуць працягваць купляць ЗПГ у ЗША, нягледзячы на тое, што той на 30 працэнтаў даражэйшы за прыродны газ з Расіі. Пуцін таксама нагадаў, што расійскія энерганосьбіты на працягу многіх гадоў забяспечвалі эканамічны і сацыяльны дабрабыт ЕС. Раней эксперты «Газпром экспарту» адзначылі, што экспарцёры ЗПГ з ЗША сталі асноўнымі бенефіцыярамі скарачэння летась паставак расійскага газу ў Еўропу.

### У Францыі заявілі аб найбуйнейшай хвалі антысемітызму з часоў Другой сусветнай вайны



Францыя сутыкнулася з найбуйнейшай хваляй антысемітызму ў пасляваеннай гісторыі. Пра гэта заявіў дэпутат парламента ад партыі «Нацыянальнае аб'яднанне» Жан-Філіп Тангі ў эфіры тэлеканала BFMTV, паведаміла ТАСС. «Наша краіна перажывае найбуйнейшую хвалю антысемітызму з часоў Другой сусветнай вайны», — адзначыў ён, каментуючы антысеміцкія акты, якія адбыліся ў Францыі за апошні месяц. Іх колькасць склала амаль 1,2 тысячы. Як паведаміў на слуханнях у Сенаце кіраўнік МУС Францыі Жэральдо Дарманен, гэта ўтрая больш, чым за ўвесь мінулы год. Гаворка ідзе як пра акцыі вандалізму, так і напады на прыватных асоб. За падобныя дзеянні затрыманы больш за 500 чалавек, у тым ліку замежнікі, якія нелегальна знаходзяцца ў Францыі. Так, паводле інфармацыі BFMTV, днямі равін адной з парыжскіх сінагог падвергся нападу ў сталічным метро. Раней афіцыйны прадстаўнік урада, міністр-дэлегат Аліўе Веран заявіў, што ўлады Францыі канстатуюць беспрэцэдэнтны ўсплёск антысемітызму ў краіне ў сувязі з эскалацыяй палесціна-ізраільскага канфлікту.

### Карціна Пікаса прададзена на аўкцыёне за больш чым $139 млн



Твор сусветна вядомага іспанскага мастака Пабла Пікаса «Жанчына з гадзіннікам» прададзены на аўкцыёне за $139,4 млн. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі» са спасылкай на аўкцыённы дом Sotheby's. Карціна стала другой па коште з калі-небудзь прададзеных на аўкцыёне работ мастака і самай каштоўнай у гэтым годзе. Твор Пікаса «Жанчына з гадзіннікам» напісаны ў 1932-м. На палатне намалявана муза мастака Марыя-Тэрэза Вальтэр з наручным гадзіннікам. З 1968 года карціна знаходзілася ў прыватнай калекцыі Эмілі Фішэр Ландау. Пасля смерці Ландау ў сакавіку 2023 года правы на продаж часткі яе калекцыі атрымаў аўкцыённы дом Sotheby's. Аб выстаўленні палатна на продаж было заяўлена ў верасні. Першапачатковая карціна ацэньвалася спецыялістамі ў $120 млн.

Рэгіёны

# ПРАМЫСЛОВЫ СЕКТАР ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ НЕ ПЕРАКРЫВАЕ

## У Магілёве падвялі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця і выкананне бюджэту вобласці за дзевяць месяцаў бягучага года

**Удзел у пасяджэнні аблвыканкама прыняў віцэ-прэм'ер Рэспублікі Беларусь Анатоль СІВАК. Як адзначыў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА, на сёння сітуацыя ў Магілёўскай вобласці стабільная.**


Фота БелТА.

Станоўчая дынаміка захоўваецца па сукупных паступленнях даходаў у кансалідаваны бюджэт вобласці, увод у эксплуатацыю агульнай колькасці жылля, аб'ёме вытворчасці імпартазамяшчальных тавараў і іншых паказчыках. Назіраецца тэмп росту намінальна налічанай сярэднямесячнай зарплаты, павышэнне даходаў грамадзян, скарачэнне выпадкаў вымушанай няпоўнай занятасці.

Пры гэтым не забяспечана выкананне паказчыкаў па інвестыцыях у асноўны капітал, уводзе ў эксплуатацыю жылля з дзяржпадтрымкай, зніжэнні выдаткаў на вытворчасць і рэалізацыю прадукцыі. Валавы рэгіянальны прадукт перавысіў узровень аналагічнага перыяду мінулага года, але зададзеных тэмпаў росту не дасягнуў. Як адзначыў **намеснік старшыні магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР,** асноўны ўплыў на недабор ВРП аказаў прамысловы комплекс, які, нягледзячы на тэндэнцыю штомесячнага прыросту, за дзевяць месяцаў не дасягнуў чаканага ўзроўню. На паказчык паўплывала таксама падзенне аптовага тавараабароту з параўнанні з мінулагоднім вынікам у сферы гандлю, нездавальняльная дынаміка ў АПК.

Значна нарошчаны аб'ёмы ў будаўнічым сектары, але на зададзеныя параметры выйсці не атрымалася. За дзевяць месяцаў засвоена без малога два мільярды рублёў у асноўны капітал. Пры гэтым мае месца недастатковае засваенне сродкаў у рамках інвестпраграм.

Губернатар вобласці звярнуў увагу на тое, што больш актыўна трэба думаць раёнам над новымі праектамі, па стварэнні якіх даў даручэнне Прэзідэнт. У Магілёўскай вобласці рэалізуецца 25 праектаў, па якіх засвоена парадку 700 мільёнаў рублёў, створана 854 новыя працоўныя месцы. Нягледзячы на пастаянны маніторынг і кантроль з боку кіраўнікоў гар-, райвыканкамаў, адбываецца адставанне ад графіка па асваенні інвестыцый. Гэта датычыцца будаўніцтва смецеперапрацоўчага прадпрыемства ў Бабруйскім раёне, арганізацыі новай лесапільнай пелетнай вытворчасці ў Бабруйску, пляцоўкі па падрыхтоўцы і сартаванні шклабою на шклозаводзе «Ялізава» ў Асіповіцкім раёне. Сёння пералік праектаў павялічыўся да 31 на суму 1,3 мільярда рублёў і стварэннем 1525 новых працоўных месцаў.

Асобна разгледжаны пытанні невыканання некаторых паказчыкаў сацыяльна-эканамічнай дзейнасці ў Бабруйску. Адно з іх датычыцца ўводу ў эксплуатацыю жылля для ваеннаслужачых. Ёсць недапрацоўкі па капрамонце дамоў ва ўстаноўленыя тэрміны. Але яшчэ ёсць час нешта выправіць да канца года або знізіць уздзеянне ад дапушчаных памылак. У цэлым, як гаварылася на пасяджэнні, сітуацыя па выкананні прагнозных паказчыкаў у рэгіёне стабільная і кіраваная.

— Мы маем паступальны рост па ўсіх кірунках, — падкрэсліў у размове з журналістамі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка. — Пакуль не дацягваем да тых прагнозных паказчыкаў, якія да нас даведзены ўрадам краіны, але з пачатку года ў нас ідзе станоўчая дынаміка. Мы на сёння перавысілі ўжо 100 % па валавым унутраным прадукце і бачым, што рост працягнецца.

Губернатар запэўніў, што ўсе вузкія месцы кіраўніцтву вобласці вядомы і ёсць разуменне, як па іх працаваць. Ёсць праблемы па шэрагу буйных прадпрыемстваў, але разам з іх кіраўніцтвам і профільнымі міністэрствамі, аблвыканкам напрацоўвае падыходы па выхадзе на ўстойлівую работу.

Віцэ-прэм'ер Анатоль Сівак адзначыў, што яму, як куратару жыллёва-гаспадарчай сферы, вельмі імпануе падыход кіраўніцтва вобласці да пытанняў, якія, на першы погляд, здаюцца дробнымі.

— Здаецца, што пытанні гучаць дастаткова дробныя, але яны не з'яўляюцца такімі для грамадзян, — рэзюмаваў ён. — І старшыня аблвыканкама звяртае на гэта ўвагу. Нават па кожным доме, дзе давалі абяцанні, але не выканалі. Такая практыка адрознівае Магілёўскі аблвыканкам, і я вельмі згодны з такім падыходам. Трэба было б гэты вопыт шырэй распаўсюджваць па ўсёй краіне. Відаць, што тыя сферы, якія закраналіся, на кантролі. Прамысловы сектар наша паўсядзённае жыццё не перакрывае. Для кожнага раёна, кожнага горада, кожнага жыхара важна менавіта тое, што датычыцца яго. Ёсць упэўненасць, што гэтыя паказчыкі, як гучала, будуць выкананы і па дарогах, і па капітальным рамонце, і па ўводзе жылля. Яшчэ шмат чаго трэба зрабіць. Інвестыцыі — таксама важны элемент. Так атрымалася, што ў цэлым па краіне асобныя рашэнні былі прыняты не ў пачатку года, таму другая палова і яго канец крыху напружаныя.

Прагучала, што ўсе праекты павінны быць зроблены ўжо сёлета, каб мы ўвайшлі ў год з планавай работай. Неспраўджаныя абяцанні людзям — планавалі зрабіць у маі, а здалі толькі ў ліпені — будуць ісці да мінімуму. Такая ж карціна па дарогах, у тым ліку па мясцовых. Ёсць агульныя патрабаванні, каб такія спісы таксама былі вывешаны на сайтах выканкамаў і людзі маглі да іх звяртацца. Што датычыцца дахаў, мы бачым: праблема нарастае, таму паставілі задачу, каб было зроблена поўнае абследаванне і складзены спіс усіх дахаў, якія патрабуюць рамонту. І для гэтага выдзелілі рэсурсы з рэспубліканскага бюджэту. Чакаем, што гэту назапашаную праблему мы вырашым.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Стандарты

# ЯКАСЦЬ ПЕРАДУСІМ

## «Зроблена ў Беларусі» становіцца нацыянальным брэндам




**Штогод у другі чацвер лістапада адзначаецца Сусветны дзень якасці, які падкрэслівае стратэгічную важнасць пытанняў якасці і яе ўдасканалення для ўстойлівага развіцця эканомікі і грамадства. У 2023 годзе гэты дзень у Беларусі праводзіцца пад дэвізам «Якасць для будучыні».**

**«У гэтым дэвізе акцэнтуецца ўвага на тым, што якасцю трэба займацца пастаянна. Якасць нашай прадукцыі — гэта ўжо брэнд Беларусі. Выпуск толькі якасных тавараў, якія карыстаюцца попытам і адказваюць чаканням спажыўцоў. Такая прадукцыя дазваляе кампаніям-вытворцам быць упэўненымі ў сваёй будучыні, стварае іміджавую аснову для дасягнення яшчэ лепшай якасці», — адзначае першы намеснік старшыні Дзяржстандарту Алена МАРГУНОВА.**

### У ЛІЧБАВЫМ ФАРМАЦЕ

Паводле яе слоў, у нашай краіне якасць — гэта эканамічная задача, важнасць якой разумеюць на самым высокім узроўні. У канцы верасня гэтага года **Прэзідэнт краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА** падчас рабочай паездкі ў Магілёўскую вобласць прапанаваў абвясціць наступны год Годам якасці.

Кірункі гэтай работы таксама пазначаныя ў прынятай на ўзроўні ўрада праграме «Якасць 2021—2025», нацэленай на пераўтварэнне айчыннай вытворчасці ў канкурэнтаздольны комплекс, які аператыўна і гнутка рэагуе на знешнюю кан'юнктуру і патрэбы ўнутранага рынку. Праграма ахоплівае як развіццё нацыянальнай інфраструктуры якасці, павышэнне кампетэнтнасці ў галіне якасці і эфектыўнага менеджменту, матывацыю і прапаганду ідэй якасці і дзелавой дасканаласці, так і праграмы павышэння якасці ў галінах.

Сёлета Дзяржстандартам і Беларускім Дзяржаўным цэнтрам акрэдытацыі праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы новага законапраекта «Аб акрэдытацыі ў Нацыянальнай сістэме акрэдытацыі». У ім, у прыватнасці, пашыраецца суб'ектны склад заяўнікаў на акрэдытацыю, замацоўваюцца крокі, накіраваныя на лічбавізацыю акрэдытацыі.

Акрамя таго, у Беларусі распрацоўваецца лічбавая платформа стандартызацыі. Пра гэта паведаміў журналістам **дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі Аляксандр СКУРАТАЎ**. Ён адзначыў, што такая платформа цалкам перавядзе жыццёвы цыкл стандарту ў электронную форму. «У гэтым кірунку ў нас плануецца ўвядзенне ў эксплуатацыю першых чэргаў на працягу 2024 года. Таксама я адзначыў бы лічбавую ініцыятыву ЕЭК, якая комплексна займаецца пытаннямі лічбавізацыі».

Аляксандр Скуратаў лічыць, што гаворка ідзе аб лічбавым тэхнічным рэгуляванні. І гэта сапраўды амбіцыйны праект. Па словах дырэктара ведамаснага інстытута, у рамках гэтага праекта ўжо ідзе практычная работа па адпрацоўцы канцэпцыі машыначытальнага лічбавага патрабавання. Сённяшняя задача — зрабіць гэтыя патрабаванні карыснымі для рэальнага сектара эканомікі і для аптымізацыі дзейнасці рэгулятараў у частцы ўпарадкавання працэсаў тэхнічнага рэгулявання.

### НА «ПЕРАДАВОЙ» — ВЫТВОРЧЫЯ ГІГАНТЫ

**Галоўны спецыяліст упраўлення аховы працы і прамысловай бяспекі канцэрна «Белнафтахім» Аляксандр ШУМІЛАЎ** расказаў, што на іх прадпрыемстве, Гомельскім хімічным заводзе, упершыню ў нашай краіне была ўкаранёна і сертыфікавана сістэма кіравання энергетычнымі рэсурсамі. Гэта досыць складаны механізм, што сведчыць аб выдатнай якасці выпускаемай прадукцыі.

На прадпрыемстве «Крыён» ўкаранёна фармацэўтычная сістэма якасці. Гэта дазволіла заводу атрымліваць прадукцыю максімальнай чысціні, у ёй выкарыстоўваецца вадкі-медыцынскі кісларод.

А **галоўны спецыяліст упраўлення знешнеэканамічных сувязяў і кааардынацыі паставак на ўнутраны рынак канцэрна «Беллеспапераапрам» Алеся ВАЛКОВІЧ** адзначыла, што на іх прадпрыемстве павышэнне якасці прадукцыі ідзе паралельна з імпартазамяшчэннем. Напрыклад, на Добрушскай папяровай фабрыцы «Герой працы» выпусцілі цэлюлознае палатно, з якога можна рабіць прадукцыю санітарна-гігіенічнага прызначэння, а таксама цвёрды кардон для вытворчасці аднаразовага посуду. А раней такія тавары закупляліся за мяжой.

### НАЙЛЕПШЫЯ НА РЫНКУ РАСІІ

У наступным годзе будзе праведзены конкурс «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі», паведаміла Алена Маргунова.

«Для стымулявання дзейнасці арганізацый па павышэнні якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, работ і паслуг, укараненні сучасных метадаў кіравання якасцю развіваецца рэспубліканскі конкурсны рух у галіне якасці. Экспертныя камісіі ўжо праводзяць ацэнку дзейнасці арганізацый-прэтэндэнтаў на званне лаўрэата конкурсу на саісканне Прэміі Урада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці ў гэтым годзе. Ацэнка праводзіцца па абноўленай мадэлі, якая з'яўляецца цяпер найбольш прасунутай і інавацыйнай сярод краін СНД», — сказала Алена Маргунова.

«У наступным годзе будзе дадзены старт новаму конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі». Ён будзе праводзіцца Дзяржстандартам і Акадэміяй праблем якасці РФ у рамках праграмы «100 найлепшых тавараў Расіі». Лічым, што гэта ініцыятыва таксама сыграе станоўчую ролю як ва ўмацаванні нашых сумесных з Расстандартам намаганняў па павышэнні якасці прадукцыі і асваенні новых яе відаў, так і ў імпартазамяшчэнні і прадстаўленні нашай прадукцыі на рынку Расіі, узмацненні развіцця інтэграцыйных, кааперацыйных сувязяў», — сказала Алена Маргунова.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПА КОЛЕРЫ І ПРЫЗНАЧЭННІ

### 3-ПАД МАЛАКА, АЛЕЮ, ХІМІІ...

Рэгіянальны палігон цвёрдых бытавых адходаў магутнасцю 60 тысяч тон стаў міжрэгіянальным аб'ектам для Аршанскага, Дубровенскага і Талачынскага раёнаў. Галоўная мэта прадпрыемства — прымаць, сартаваць, перапрацоўваць і захоўваць цвёрдыя камунальныя адходы так, каб мінімізаваць колькасць смецця, якое не падлягае ўтылізацыі.

*— Лінія сартавання дазваляе сартаваць другасныя матэрыяльныя рэсурсы не толькі па саставу (пластык, шкло, папера, метал), але і па колеры і прызначэнні. Сартаванне тут адбываецца ўручную, і кожнаму работніку даведзена задача вымаць канкрэтны від упакоўкі: малочныя бутэлькі, з-пад хіміі, празрыстыя і г. д., —* пракаментаваў **Андрэй РАМАШКА, намеснік міністра ЖКГ**. — *У рэзервуарах для пэўнага віду адходаў відаць, што сыравіна адсартавана якасна. Яна адбіраецца зыходзячы з запытаў канкрэтнага перапрацоўшчыка-вытворцы.*



Цыкл палігона пачынаецца з узважвання адходаў і вымярэння радыяцыйнага фону. У залежнасці ад віду адходы накіроўваюць на спецыялізаваныя ўчасткі. Там адбываецца механічная перапрацоўка і паўаўтаматычнае сартаванне змешаных цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) з выманнем другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР).

*— Аб'ект досыць перадавы, і самыя брудныя і непрыемныя аперацыі робяць машыны. Выбіраецца арганіка для кампаставання, другасная сыравіна для перапрацоўкі, будзе рабіцца і RDF-паліва для ўжывання на энергаёмістых прадпрыемствах,* — заўважыў **Аляксандр СУБОЦІН, старшыня Віцебскага аблвыканкама**, *які прысутнічаў на запуску новага завода.*

У зоне ЦКА адходы сартуюцца і з іх здабываецца другасная сыравіна. На сартавальным комплексе ўстаноўлены аптычны сканер, балістычны сепаратар, віхратокавы сепаратар і магнітныя сканеры. Дзякуючы гэтым прыладам адходы праходзяць тры стадыі сартавання. Спачатку візуальны агляд смецця, затым пагрузчыкам адходы падаюцца ў раздзіральнік пакетаў, дзе яны вызваляюцца ад «тары», пасля — на канвеер, дзе смецце дадаткова аглядаюць і вымаюць з яго інертныя матэрыялы і шклабой.

*— Пасля папярэдняга сартавання адходы паступаюць у балістычны сепаратар, дзе яны падзяляюцца на фракцыі: аб'ёмную 3D і плоскую 2D, —* расказаў **Аляксандр ПАРФЁНАЎ, намеснік дырэктара прадпрыемства «Аршанская спецаўтабаза»** (менавіта яго дачэрнім прадпрыемствам стаў палігон ЦКА). — *3D-фракцыя адпраўляецца на віхратокавы сепаратар, дзе з яе аддзяляюцца каляровыя металы. Потым адходы, якія ўтрымліваюць ДМР, ідуць на ручное сартаванне. 2D-фракцыі накіроўваюць на аптычны сканер, які дазваляе раздзяліць адходы па відах. У кожным этапе сартавання прыстыкоўваюць магнітныя сепаратары для вымання чорных металаў.*

Адабраная са смецця ў розныя рэзервуары другасная сыравіна трапляе на прэс, які дадаткова абсталяваны перфаратарам для праколвання ПЭТ-бутэлек. Адсартаваны шклабой і чорныя металы ідуць на склад часовага захоўвання. Для пластыку, ПЭТ-бутэлек, бляшанак і макулатуры прызначаны другі склад. Фракцыі да 70 міліметраў і зялёныя раслінныя адходы адпраўляюцца на корты кампаставання, а смецце, якое не падлягае перапрацоўцы, — на корты захавання.

*— У цюкі асобна прасуюцца папера, цэлафан, бляшанкі, ПЭТ-бутэлькі, тара з-пад хіміі, каністры, якія пасля адпраўляюцца на заводы на перапрацоўку. Лініі ўсё робяць самі, мне дастаткова толькі сачыць, каб абсталяванне працавала правільна і не давала збою, —* заўважыў **прасаўшчык палігона Ігар КУРАНАЎ**, задача якога — назіраць за работай ліній прэса і канвеера.

### ДРАЎНІНУ — НА ШЧАПУ, БУДАЎНІЧАЕ СМЕЦЦЕ — НА ШЧЭБЕНЬ

На пачатку будаўніцтва смеццесартавальнага завода пад вёскай Солаўе яго кошт складаў крыху больш за 120 мільёнаў рублёў, аднак дзякуючы карэкціроўцы праектных рашэнняў і выгаднай закупцы матэрыялаў удалося сэканоміць звыш 35 мільёнаў. Галоўным інвестарам стала прадпрыемства «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў». На прадпрыемстве, як плануецца, з'явіцца 127 новых рабочых месцаў, 56 з якіх — для сартавальнікаў. Сярэдні заробак для працаўнікоў у 2024 годзе прадугледжаны 1130 рублёў.

Адзін з тэхналагічных этапаў работы са смеццем на прадпрыемстве — сартаванне і часовае захоўванне буйнапамерных адходаў з выманнем з іх каштоўных рэсурсаў. У зоне буйнапамерных адходаў іх перарабляюць на адпаведных устаноўках (яны, дарэчы, мабільныя, таму могуць выкарыстоўвацца непасрэдна па месцы ўтварэння будаўнічых адходаў). Атрымануюшляхам драбнення буйнапамерных і драўняных адходаў дзелавую шчапу плануюць выкарыстоўваць для ўласных патрэб кацельнай палігона, а таксама прадаваць іншым прадпрыемствам. А другасны шчэбень са скрышаных будаўнічых адходаў — для рамонту і ўтрымання вулічна-дарожнай сеткі Оршы і раёна.

Бітумаўтрымлівальныя адходы, якія перапрацоўваюцца на асобнай устаноўцы, стануць бітумізаваным кардонам (яго плануюць рэалізоўваць кампаніям, якія выпрацоўваюць сухія сумесі для дахавых масцік) і бітумнай крошкай (для дарожнага будаўніцтва).

На прадпрыемстве ёсць таксама некалькі рэзервуараў для фільтрацыі сцёкавых вод. Такім чынам, работа комплексу дазволіць сартаваць і апрацоўваць усе віды смецця, што ствараецца ў рэгіёне, і адпраўляць на другаснае выкарыстанне, у тым ліку тыя камунальныя адходы, якія раней захоўваліся на палігонах.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Класныя навіны

# КАМП'ЮТАРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ, АРХІТЭКТУРА І РОБАТАТЭХНІКА...

**Міністэрства адукацыі зацвердзіла праграмы пяці новых факультатыўных заняткаў: «У свеце архітэктуры і дызайну: выбіраем прафесію», «Асновы інжынерна-тэхнічнай творчасці», «Займальная робататэхніка», «Асновы рацыянальнага прыродакарыстання і аховы прыродных рэсурсаў» і «Сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі: ад гульні да прафесіі».**

Наведваць факультатывы змогуць вучні 8—10-х класаў.

Мяркуецца, што ў выніку асваення праграмы **факультатыву «У свеце архітэктуры і дызайну»** школьнікі будуць валодаць базавымі тэхналагічнымі кампетэнцыямі, развітым тэхналагічным мысленнем, асновамі тэхнаэтыкі і эстэтыкі, азнаёмяцца з сучасным узроўнем тэхналогій і зместам прафесійнай дзейнасці ў сферы архітэктуры і дызайну.

Навучэнцы будуць ведаць асноўныя помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва Беларусі, віды дзейнасці ў галіне архітэктуры і дызайну, метады і тэхнічныя прыёмы архітэктурнага макетавання, камп'ютарныя метады візуалізацыі архітэктурных і архітэктурна-дызайнерскіх аб'ектаў, ключавыя канцэпцыі 2D- і 3D-праектавання. Яны навучацца мадэляваць і макетаваць архітэктурна-дызайнерскія аб'екты, выкарыстоўваць колер у праектаванні і дызайне архітэктурнага асяроддзя, абгрунтоўваць каларыстычнае рашэнне, выкарыстоўваць графічныя рэдактары і камп'ютарныя праграмы для распрацоўкі дызайн-праектаў і інш.

**На факультатыве «Асновы інжынерна-тэхнічнай творчасці»** школьнікаў навучаць, напрыклад, характарызаваць канструктыўныя асаблівасці аўтамабіляў, вызначаць асаблівасці функцыянавання бензінавага, дызельнага рухавікоў унутранага згарання, электрарухавіка, адрозніваць віды лазераў, рабіць гравіроўку на розных матэрыялах, атрымліваць наноструктуры хімічных металамі, канструяваць розныя мадэлі ўстановак для атрымання энергіі з аднаўляльных крыніц і гэтак далей.

**На факультатыве «Займальная робататэхніка»** навучэнцы даведаюцца аб асноўных метадах і спосабах канструявання механізмаў аўтаматычных прылад, прынцыпах кіравання перыферыйнымі прыладамі камп'ютара, мікракантролера. Асвояць фізічныя асновы электронікі, механікі, схематэхнікі. Яны змогуць, у прыватнасці, вырашаць тыпавыя задачы па электроніцы і схематэхніцы, распрацоўваць алгарытмы праграм, ствараць 3D-мадэлі робататэхнічных прылад і дэталяў элементаў канструкцыі, чарцяжы на іх аснове, праграмаваць мікракантролеры ў праграмным асяроддзі Arduino IDE.

**Факультатыў «Асновы рацыянальнага прыродакарыстання і аховы прыродных рэсурсаў»** навучыць падлеткаў вызначаць па вонкавых прыкметах мінералы і горныя пароды, іх фізічныя ўласцівасці, вырошчваць крышталі, вызначаць іх будову і ўласцівасці, працаваць з прыборамі і абсталяваннем, прызначанымі для маніторынгу стану навакольнага асяроддзя, рыхтаваць асяроддзе для пасеву мікраарганізмаў, праводзіць мікраскапіраванне мікраарганізмаў і раслінных аб'ектаў, выкарыстоўваць кантрольна-вымяральныя прыборы для кантролю якасці вады...

Што датычыцца **факультатыву «Сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі: ад гульні да прафесіі»**, то пры засваенні яго праграмы школьнікі азнаёмяцца з магчымасцямі і асноўнымі элементамі мовы разметкі HTML, асноўнымі CSS-уласцівасцямі, якія выкарыстоўваюцца пры стылізацыі вэб-старонак, відамі інфармацыі і метадамі яе абароны. Яны будуць умець, напрыклад, ствараць вэб-старонкі, рашаць лагічныя задачы, звязаныя з распрацоўкай архітэктуры вэб-старонкі, планаваць і ажыццяўляць праектаванне, праграмнае мадэляванне аб'ектаў віртуальнай і дапоўненай рэальнасці, аналізаваць перадачу даных у лакальных сетках, вызначаць мэты і задачы, якія вырашаюцца ў рамках процідзеяння сеткавым кібератакам.

Навучальныя праграмы факультатываў былі распрацаваны для сучаснага практыка-арыентаванага навучання і прызначаны для правядзення заняткаў з высокаматываванымі, адоранымі і таленавітымі навучэнцамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Кнігі ў падарунак

# АКАДЭМІЯ МАСТАЦТВАЎ ПАПОЎНІЛАСЯ КІТАІСТЫКАЙ

**Прадаўжаецца рэалізацыя праекта «Кнігі пра Кітай — моладзі Беларусі», арганізаванага Пасольствам Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь пры падтрымцы Выдавецкага дома «Звязда». Розным установам адукацыі, якія так ці інакш звязаны з вывучэннем кітайскай мовы, развіццём беларуска-кітайскіх адукацыйных стасункаў, уручаюцца бібліятэчкі кніг па кітайскай тэме, якія выйшлі ў свет апошнія гады ў Выдавецкім доме «Звязда».**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Чарговае ўручэнне кніг разам з сертыфікатам ад Пасольства КНР у Беларусі і Выдавецкага дома «Звязда» прайшло ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Удзел у мерапрыемстве прынялі рэктар навучальнай установы Міхаіл Баразна і дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч. Міхаіл Рыгоравіч адзначыў высокі ўзровень паліграфічнага і выдавецкага выканання кніг на кітайскую тэму. Найперш — паэтычных зборнікаў класікаў кітайскай літаратуры ў серыі «Светлыя знакі: паэты Кітая».

Рэктар Акадэміі мастацтваў звярнуў увагу на тое, што варта было б наладзіць болей цеснае супрацоўніцтва навучальнай установы і выдавецкага дома. Найперш — у прыцягненні студэнтаў да афармлення кніжнай прадукцыі. У сваю чаргу «звяздоўцы» назвалі цэлы шэраг імёнаў выпускнікоў ВНУ, якія супрацоўнічалі ці супрацоўнічаюць з выдавецтвам. Кнігі для «Звязды» афармлялі і такія аўтарытэтныя майстры, як народны мастак Беларусі Арлен Кашкурэвіч, народны мастак Беларусі Георгій Паплаўскі, народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік, графікі і жывапісцы Каміль Камал, Віталь Ударэнка, Сяргей Волкаў і інш., лёс якіх самым цесным чынам звязаны з акадэміяй.

У час сустрэчы прагучалі і прапановы па актывізацыі медыйнага супрацоўніцтва. Ішла размова пра маючы адбыцца ў 2025 годзе юбілей творчай навучальнай установы. Нагадаем, што Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў заснавана ў 1945 годзе.

**Кастусь ХАДЫКА.**

# «Я З ВЁСКІ» — ХІТ У ІНТЭРНЭЦЕ

**Тэлепраект «Я з вёскі» прыцягвае заваёўваць увагу не толькі гледачоў канала «Беларусь 2», але і карыстальнікаў YouTube. Новыя выпускі каларытнага шоу набіраюць там сотні тысяч праглядаў, упэўнена набліжаючыся да мільённых паказчыкаў.**

Кожны тыдзень вядучы праекта Васіль Чэхаў разам са здымачнай групай выпраўляецца на пошукі крэатыўных беларусаў, якія з'ехалі з горада, каб пачаць сваю справу ў вёсцы.

І за час свайго існавання шоу знайшло аўдыторыю прыхільнікаў не толькі сярод тэлегледачоў, але і ў інтэрнэце. За год яго выпускі паглядзелі больш за сем мільёнаў разоў. Як адзначае кіраўнік праекта «Я з вёскі» Герман Малышыцкі, «гэта адзін з самых папулярных забаўляльных беларускіх праектаў у інтэрнэце. Нас глядзяць не толькі ў Беларусі: 70 % гледачоў з іншых краін, прычым не толькі з СНД, але і з Еўропы, ЗША. Мы ў сваю чаргу хочам паказаць, як выглядае сучасная беларуская вёска. Чытаем і каментарыі пад выпускамі праграмы, у якіх многія пішуць, што не могуць паверыць, быццам ёсць месца, дзе просты чалавек можа атрымаць гектары зямлі, займацца гаспадаркай і развіваць пры гэтым на падтрымку дзяржавы. І, вядома, перадаюць словы захаплення краіне і нашаму Прэзідэнту».

Прычым аўтары праекта адзначаюць, што большая частка аўдыторыі ў інтэрнэце — гэта маладыя людзі ва ўзросце да 40 гадоў. Нагадаем, забаўляльнае шоу «Я з вёскі» выходзіць у тэлеэфіры кожную нядзелю. І адразу пасля гэтага новыя выпускі з'яўляюцца ў доступе на YouTube-канале «Беларусь 2».

## ШАШКІ

(«Звязда»)

Выпуск № 204

На маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках-64, які праходзіў у Турцыі, у хуткай праграме залаты медаль выйграла Аляксандра Спірына (Д27), Арцём Ціханаў (Ю20), Вікторыя Нікалаева (Д20) і Дар'я Нікіфарава (Д17) сталі другімі, Паліна Пятрусёва (Д27) і Міхаіл Усціменка (Ю9) — трэцімі.

20–22 кастрычніка адбылася X комплексная спартакіяда ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» па сямі відах спорту. У спаборніцтвах шашыстаў сярод 14 каманд перамаглі прадстаўнікі Партызанскага раёна.

**№ 171**



**№ 171** Г. Андрэеў

**Белыя простыя:** c1 ,e1, g1, f2, g3, f4, g5, f6, h6 (9)

**Чорныя простыя:** d2, c3, e3, b4, d4, a5, c5, c7, f8, h8 (10)

**№ 172** Валерый Свізінскі (Мінск)

**Белыя простыя:** e1, h2, a3, g3, h4, g5 (6)

**Чорныя простыя:** d4, e5, d6, h6, d8, h8 (6)

Праблемы ў шашкі-100 даслаў Анатоль Баланюк, г. Цепладар Адэскай вобласці.

**№ 173**

**Белыя простыя:** 11, 18, 27, 33, 35, 37, 44, 47 (8)

**Чорныя простыя:** 6, 8, 9, 19, 22, 24, 30, 45 (8)

**№ 174**

**Белыя простыя шашкі:** 11, 18, 24, 27, 30, 37, 42, 47 (8)

**Чорныя простыя шашкі:** 6, 9, 14, 22, 35, 36, 39, 40 (8)

**№ 175**

**Белыя простыя:** 11, 18, 27, 29, 37, 41, 47 (7)

**Чорныя простыя:** 6, 9, 10, 22, 28, 30, 36, 39, 40 (9)

Астатнія кампазіцыі складзены па правілах бразільскіх шашак вядучым рубрыкі.

**№ 176**

**Белыя простыя:** c1, b2, d2, d4, a7 (5)

**Чорныя простыя:** a3, g3, b4, h4, g5, e7 (6)

**№ 177**

**Белыя простыя:** c1, b2, e3, b4, a7 (5)

**Чорныя простыя:** g3, f4, h4, c5, g5, e7, g7 (7)

**№ 178**

**Белыя простыя:** c1, d2, c3, e3, c5, a7 (6)

**Чорныя простыя:** a3, g3, f4, h4, g5, e7 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні**

Выпуск № 203 ад 27.10.2023.

№ 163 1. h6-g7 h8:f6 2. d2-e3 f4:d2 3. a7-b8 d6:b4 4. d4-c5 b4:d6 5. b8:a3 g5-f4 6. a3:f8 f4-e3 7. f8-h6 e3-f2 8. h2-g3 f2:h4 9. h6-f4 f6-g5 10. f4:h6 h4-g3 11. h6-e3 g3-h2 12. e3-g1+

№ 164 1. a3-b4 c3:a5 2. e1:c7 d8:b6 3. f4-e5 f6:d4 4. h2-g3 h4:f2 5. g1:a7 a5-b4 6. a7-b8 b4-c3 7. b8-f4 c3-b2

[ 7...h8-g7 8. h6:f8 c3-b2 9. f8-g7 b2-c1 10. g7-h6 ]

8. f4-e5 b2-a1

[ 8...b2-c1 9. e5-f4 ]

9. e5-f6 a1:g7 10. h6:f8+ ППР: 1. h2-g3 h4:f2 2. g1:g5 d8-c7

(2...d2-c1 3. a3-b4 c3:a5 4. e1-d2 c1:e3 5. f4:d2 d8-c7 6. g5-f6

c7-d6 7. d2-c3 d6-c5 8. f6-e7 c5-b4 9. e7-d8 b4:d2 10. h6-g7

h8:f6 11. d8:c1 x.) 3. a3-b4 c3:a5 4. e1:c3 c7-b6 5. f4-e5 b6-c5

6. e5-d6 c5:e7 7. g5-f6 e7:g5 8. h6:f4 h8-g7 9. f4-g5x. Указаў С. Бурко.

№ 165 1. b2-c3 e1:a5 [ 1...e1:b4 2. c7-d6 c5:e7 3. d8:a5 ]

2. c7-b6 a5:c7 3. d8:g1+

№ 166 1. c5-d6 e7:a7 2. e3:c5 g5:g1 3. c7-d8 h4:f2 [ 3...g1:b6 4. d8:e1 h4:f2 5. e1:d8 ]

4. d8:a5 g1:b6 5. a5:d8 g7-f6 6. d8:h4 a7-b6 7. h4-f2 b6-a5 8. f2-e1 h6-g5 9. e1-d2 g5-h4 10. d2-e1 a5-b4 11. e1:a5 h4-g3 12. a5-b6 g3-h2 13. b6-g1+

№ 167 лег. dc7 ba5 de3 ff6 исх. 1. e1-f2 d8:d4 2. c3:g7 a5:a1 3. f2:f6 a7-b6 4. g7-h8 a1:g7 5. h8:a7+

№ 168 1. f6-e7 h4:b6 2. e7-d8 e3:g5+

№ 169 1. f6-e7 h4:b6 2. e7-d8 e3:g5 3. d8:a1 f8-g7 4. a1-b2 g7-f6 5. b2:g7 h8:f6 6. g1-f2 f6-e5 7. f2-e3+

№ 170 1. d2-c3 e5:e1 2. e3-f4/e3d4 e1:b4 3. a3:e7 d8:f6 4. f4-e5/d4e5 f6:d4 5. h2-g3 h4:f2 6. g1:a7+

Першымі дакладныя адказы даслалі: С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Ваўчкоў (Маладзечна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013», e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## СУСТРАКАЙЦЕ ЭКСТРЫМ-ТЭЛЕШОУ «ГЕРОІ. ПЕРАЗАГРУЗКА»

**Ужо ў гэтую нядзелю, 12 лістапада, на тэлеканале «Беларусь 1» стартуе прэм'ера сіквэла любімага многімі экшн-шоу «Героі». Аднак цяпер тэлеаўдыторыю чакае сапраўдная зорная «Перазагрузка». Услед за юнакамі і дзяўчатамі, якія прафесійна займаюцца пажарна-прыкладным спортам, на кібеpарэну выйдуць беларускія селебрыці.**



Тут 24 зорным удзельнікам з 8 каманд давядзецца выйсці з зоны камфорту і пад прыцэлам тэлекамер сустрэцца са сваімі страхамі на кіберарэне. Прычым з'явяцца яны не пад псеўдонімамі, а пад сваімі рэальнымі імёнамі. І прадэманстраваць ім давядзецца не толькі сваю фізічную падрыхтоўку, але і ўменне працаваць у камандзе, а таксама не баяцца рызыкаваць і пераадольваць уласную няўпэўненасць дзеля агульнага выніку.

Яшчэ ў перыяд здымак рэжысёр-пастаноўшчык праекта Анжаліна Мікульская адзначыла, што «першапачаткова падумалі, можа, нам зрабіць выпрабаванні больш лёгкімі, бо не ўсе тут спецыялісты спартыўнага профілю. Але калі ўдзельнікі прыйшлі на брыфінгі, калі была тэхнічная падрыхтоўка, то мы ўбачылі нядрэнную фізічную форму, яны рыхтаваліся. Потым пачалі выпрабоўваць сябе, і мы зразумелі, што спраўляюцца. Пакінулі ўсё як было...».

